# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ НЕКАТОРЫХ ГРАВЮР З КНІГ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

**Канчак Уладзіслаў Вячаслававіч, Беларусь**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык Ратынская Н.В.*

В данной работе, основываясь на современных исследованиях, проводится анализ гравюр из книг Франциска Скорины путём их сопоставления и установления взаимосвязи изобразительных методов гравёров с историческим и культурологическим контекстом написания данных книг. Кроме того, автор даёт оценку роли Франциска Скорины как исторического деятеля для белорусского народа и его причастности к эпохе Возрождения

*Ключевые слова: Франциск Скорина, 500-летие издания первой печатной книги на языке восточных славян, Возрождение, Белорусское Возрождение, гравюры, сигнет, белорусский первопечатник, анализ, сравнение, Лука Скорина, XVI век, Великое Княжество Литовское.*

# COMPARATIVE ANALYSIS OF SOME PRINTS FROM THE BOOKS OF FRANCIS SKARYNA

**Kanchak Uladzislau, Belarus**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*
*Scientific supervisor – senior lecturer Ratunskaya N. V.*

In this scientific work, based on modern research, an analysis of prints from books by Francysk Skaryna is carried out by comparing them and establishing the interdependence between the graphic methods of engravers and the historical and cultural context of the writing of these books. Also, the author measure the role of Francysk Skaryna as a historical figure for the Belarusian people and his involvement in the Renaissance.

*Keywords: Francysk Skaryna, 500th anniversary of the publication of the first printed book in the language of the Eastern Slavs, Renaissance, Belarusian Renaissance, engravings, prints, signet, Belarusian first printer, analysis, comparison, Luka Skarina, XVI century, Grand Duchy of Lithuania.*

У 2017 годзе святкуецца 500-годдзе выдання Францыскам Скарынам кнігі «Псалтыр», першай друкаванай кнігі на мове ўсходніх славян. У кантэксце свята трэба ўдзяліць значна больш увагі асобе першадрукара.

Аналіз выяў твару Францыска Скарыны быў пачаты з найбольш вядомай гравюры, змешчанай аўтарам ў кнізе «Быццё», - аўтапартрэта. На ім выразна бачны твар самога Скарыны. Гэты партрэт сведчыць, што Францыск Скарына



Репозиторий БГМУ

меў шырокі круглы твар, вялікія вочы, двайное падбароддзе і доўгі нос з вялікай гарбінкай. Калі звярнуць увагу на герб-сігнет, змешчаны на рушніку, то можна заўважыць такія самыя рысы твару на сонцы і месяцы, дзе яны вельмі індывідуалізаваныя і персаналізаваныя, у адрозненне ад іншых сігнетаў, размешчаных у розных выданнях Скарыны, дзе яны выкананы недакладна і непадрабязна, але з наданнем адценняў эмоцый. Такім чынам, да вядомых падпісаных партрэтаў Францыска Скарыны можна дадаць яшчэ і твары сонца і месяца з гравюры.

Далей былі прааналізаваны іншыя вядомыя гравюры з кніг Францыска Скарыны. Ніжэй прыведзены тыя гравюры, аналіз якіх даў цікавы для даследавання вынік.

У 1519 годзе ў Празе выйшла кніга «Лічбы», ны тытульным лісце якой змешчана гравюра "Людзі Ізраілевы з палкамі каля Храма Божага" (малюнак 3а). На гэтай гравюры бачны не біблейскія, а сучасныя Скарыне еўрапейскія рэаліі: адзенне і ўзбраенне адпавядаюць XVIстагоддзю. На сцягах заўважны гербы магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага: Радзівілаў, Астрожскіх, Гаштольдаў, а таксама герб Святой Рымскай Імперыі. Наперадзе калоны рыцараў заўважны малады чалавек са сцягам, на якім размешчаны сігнет Скарыны, а ўнізе – трохкутнік, які прысутнічае і на падпісаным партрэце з кнігі «Быццё». Аблічча маладога чалавека цалкам адпавядае рысам Францыска Скарыны, вызначаным раней. Такім чынам, друкар змяшчае сябе на чале войска, складзенага з магнатаў ВКЛ і еўрапейскіх рыцараў. У выніку можна казаць пра яшчэ адзін вядомы партрэт Скарыны, на гэты раз, у юнацтве. Таксама мы можам казаць пра разуменне Скарынам сваёй мэты, місіі і ролі ў гісторыі, пра своеасаблівы гумар першадрукара.

Вызначыўшы прынцып непадпісаных партрэтаў, закладзены Скарынам ў свае кнігі, аналізуем гравюру "Ісус Навін вядзе людзей Ізраілевых праз Іардан" з кнігі "Ісус Навін", выдадзенай у Празе ў 1517 годзе. Адзенне людзей, выяўленых на гэтай гравюры, падобна на вопратку беларускіх рамеснікаў і сялян XVIстагоддзя. Большасці фігур уласцівы дакладныя прапорцыі, акрамя галоў, якія крыху велікаватыя. Тыпаж вобразаў славянскі. Калі ўважліва разгледзець хлопчыка за спінай Ісуса Навіна, то можна заўважыць раней вызначаныя рысы Францыска Скарыны: шырокі круглы твар, вялікія вочы, нос з гарбінскай. Значыцца, перад намі партрэт Скарыны ў дзяцінстве. Злева ад хлопчыка стаіць чалавек у нябедным адзенні і трымае руку на галаве малога Францыска. Магчыма, гэта Лука Скарына, бацька першадрукара. Ззаду выяўлена жанчына з дзіцём на руках, якая мае падобныя да Скарыны рысы твару. Мяркуем ,што гэта маці Францыска Скарыны з ягонай сястрой на руках. У выніку маем партрэт маленькага Францыска Скарыны і яго бацькоў.

Вытокамі метадаў Скарыны выяўляць сябе і сваіх сваякоў у выглядзе біблейскіх персанажаў могуць служыць творы мастакоў Адраджэння, сучаснікаў Скарыны, напрыклад, карціны і гравюры Альбрэха Дзюрэра. У серыі «Апакаліпсіс» баварскі мастак надаў твары тагачасных курфюрстаў нябесным анёлам, а на карціне "Свята ружанцаў" ён выявіў сябе ў кампаніі Хрыста, Багародзіцы, папы Юлія II і імператара Максімільяна I.



Репозиторий БГМУ

Такім чынам, падчас даследніцкай працы былі вызначаны некалькі новых партрэтаў Францыска Скарыны ў розным узросце, партрэты бацькоў Францыска Скарыны, было адзначана, што дзейнасць Скарыны адпавядала эпосе Адраджэння, якая панавала ў Еўропе ў той час, а таксама, тое, што першадрукар усведамляў сваю важную ролю для сваёй краіны.